*А.І.СМОЛІК*

# КУЛЬТУРНЫ КАНТЭКСТ
# ВЫШЭЙШАЙ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Дынамічнасць працэсаў, якія ахапілі ўсе ўзроўні жыццядзейнасці сучаснага грамадства, асабліва глыбока закранула сацыякультурную сферу.

Усебаковае асэнсаванне ролі культуры ў трансфармацыйны перыяд сведчыць аб тым, што сацыяльна-культурная дзейнасць аб’ектыўна становіцца ўмовай удасканалення сацыяльнай рэчаіснасці, важнай формай самавыяўлення, самарэалізацыі асобы. Перамены ў змесце і арганізацыі сацыяльна-культурнай, адпачынкавай дзейнасці, якія распачаліся ў канцы 80-х гг. XX ст., патрабавалі пераасэнсавання і карэкціроўкі дзейнасці навучальных установаў па падрыхтоўцы работнікаў культуры і мастацтва.

Ва ўмовах пераходнага перыяду, фарміравання новага глабальнага мыслення чалавека XXI ст. выспявае новая парадыгма зліцця адукацыі і культуры, за аснову якой бярucца ўяўленні аб гуманістычным тыпе асобы, мадэль чалавека, які не толькі спажывае культурныя каштоўнасці, але стварае і развівае іх па прычыне прафесійнай і асобаснай патрэбнасці, асобы як самакаштоўнасці, самадастатковасці чалавека – не толькі мэты, але і сродку грамадскага развіцця.

Дыялектычнае ўзаемадзеянне адукацыі і культуры забяспечвае вытворчасць, трансляцыю, засваенне і спажыванне ведаў і каштоўнасцей сацыякультурнага вопыту. Падыход да сутнасці культуры як да сістэмнай сукупнасці духоўных, мастацкіх і матэрыяльных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам на працягу яго гісторыі, дазваляе стуктураваць гуманітарную адукацыю з мэтай адлюстравання ў вучэбным працэсе асноўных пластоў культуры з сінхранічнага пункту гледжання і ў працэсе гістарычнага развіцця ў часе – з дыяхранічнага.

Адпаведнасць гуманітарнай адукацыі структуры самой культуры патрабуе такой яе пабудовы, якая дазваляла б спецыялістам розных профіляў вывучаць культуру ў цэлым і ў гарызантальным, і ў вертыкальным разрэзе з азнаямленнем з асноўнымі відамі і тыпамі культуры з мэтай стварэння ў свядомасці студэнта цэльнай карціны пэўнай эпохі або ўзроўню і зместу культуры. Гаворка ідзе аб тым, каб спецыялісты розных профіляў маглі з поспехам працаваць над рашэннем агульных адукацыйных задач.

Доўгі час на працягу XX ст. адукацыйныя цэнтры былі адначасова і асяродкамі культуры, і суб’ектамі яе творчасці, і суб’ектамі спажывання артэфактаў. Гэта дазваляла разглядаць працэсы адукацыі і культуры як два бакі адзінага працэсу антрапа- і сацыягенезу. Але пастутова сфарміравалася арыентацыя адукацыі не на перспектыву развіцця культуры, а на яе рэтраспектыву. Аслабленасць прагнастычнага элемента адукацыі, малая колькасць даследаванняў тэндэнцый развіцця культуры ў будучым, традыцыя вывучэння культур, якія зніклі ў часе, іх ідэалізацыя і часта фетышызацыя абмяжоўваюць магчымасць насычэння зместу гуманітарнай адукацыі сучасным матэрыялам, фактамі вышэйшага ўзроўню развіцця культуры свету ў XXI ст.

Часткова апраўданнем гэтага могуць быць імкненне вышэйшай школы перадаваць устойлівыя ў навуцы факты і з’явы, паняцці і тэндэнцыі, прывязанасць да прыкладных вынікаў і прызнаных ідэй. Аднак інтэнсіўнае развіццё навукі і культуры, імклівы рост патрэбнасці ў спецыялістах, хуткае змяненне патрабаванняў грамадства да іх падрыхтоўкі будуць павялічваць наступствы такога адставання. Праблема гэтая вельмі сур’ёзная. Сітуацыя можа ўскладніцца пры пераходзе вышэйшай школы да двухузроўневай сістэмы гуманітарнай адукацыі. Справа ў тым, што значнае скарачэнне блока сацыяльна-гуманітарных дысцыплін паспрыяе разыходжанню функцыянальна-прафесійных ведаў з гуманістычнымі каштоўнасцямі. Рэзкае памяншэнне часу на вывучэнне гуманітарных дысцыплін, выключэнне асобных навук з першага блока вучэбнага плана будуць садзейнічаць адасабленню прыродазнаўчых і спецыяльных ведаў ад сацыяльных і гуманітарных, у выніку чаго парушыцца адзінства “вытворчасці” духоўных каштоўнасцей, іх пераводу ў перакананні, погляды, нормы і паводзіны будучых спецыялістаў.

З пункту гледжання культурна-антрапалагічнага падыходу, сэнсакаштоўнасны статус адукацыі праяўляецца ў вызначэнні яго як рэгулятыўнай практыкі. Як рэгулятыўная практыка вышэйшая адукацыя павінна ставіць сваёй мэтай трансляцыю і культываванне агульнапрынятых ў беларускім грамадстве ідэй, правіл, нормаў, узораў паводзін. Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны якраз і павінны выконваць культуратворчыя і чалавекафарміруючыя задачы, што, безумоўна, уплывае на ўстойлівае развіццё грамадства і яго бяспеку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адасабленне прыродазнаўчых дысцыплін ад сацыяльных і гуманітарных парушае адзінства “вытворчасці” духоўных каштоўнасцей, іх перадачу і засваенне. Дыферэнцыяцыя гэтых працэсаў спарадзіла ўнутраную раз’яднанасць нават гуманітарных дысцыплін, культурны кантэкст якіх не звязваўся адзіным культурным полем і традыцыямі айчыннай і сусветнай культуры. Нават у такім маналітным і развітым відзе культуры, як мастацкая, адукацыя ў розных жанрах вельмі аўтаномная: спецыялізацыі ў галіне музыкі не перакрыжоўваюцца з вывучэннем выяўленчага мастацтва, музыкі – з харэаграфіяй і інш.; дысцыпліны, як правіла, сканцэнтраваны толькі ў рамках спецыялізацыі, часта не выконваецца і сінхранічны прынцып навучання. Дадзеная праблема паглыбілася ў сувязі з увядзеннем у Дзяржаўны класіфікатар спецыяльнасцей і кваліфікацый, кірункаў і спецыялізацый, што канчаткова падзялялі адукацыю ў сферы культуры на розныя спецыяльнасці, часта зусім не звязаныя адна з адной.

Пераадоленне “павідавога” вывучэння культурна-гістарычнага працэсу, калі гісторыя культуры падмяняецца або адным відам мастацтва, або сукупнасцю відаў, або адной галіной культуры, блізкай да пэўнай спецыяльнасці або напрамку, храналагічнае супадзенне вывучэння розных гісторыка-культурных дысцыплін, усталяванне сувязей паміж рознымі прадметамі – складаючымі адзінага культурнага працэсу – дазваляюць стварыць у свядомасці студэнта цэльную карціну развіцця свету, “ужыць” яго ў культурна-гістарычную канву пастУпальнага руху цывілізацыі, зрабіць суб’ектам і аб’ектам культурнага працэсу, гэта значыць зрабіць тое, што называюць у еўрапейскай культуралогіі “інкультураваць” .

Выкладанне гісторыі і тэорыі культуры як тэарэтычнай мадэлі сінтэтычнага асваення вобразаў і стыляў культуры розных эпох, раскрыццё спосабаў інтэрпрэтацыі сэнсаў і знакаў, сінкрэтычнае інтэграванае вывучэнне розных элементаў гэтай шматмернай структуры – задача любога гуманітарнага універсітэта краіны.

Сучасны стан вышэйшай гуманітарнай адукацыі прывёў да змены сутнасці паняцця “адукаваны чалавек”. Яно стала сінонімам “інфармаванага чалавека” і адасобілася ад паняцця “культурны чалавек”. Вядома, што важнейшымі характарыстыкамі разумнага чалавека з’яўляюцца яго здольнасці да знакава-сімвалічнай і прадметна-пераўтваральнай, творчай дзейнасці. Культура і адукацыя – асноўныя сродкі развіцця гэтых здольнасцей.

Духоўная культура ёсць праява ідэальнага, родавага, сутнаснага пачатку чалавека, які на універсальнай аснове здольны ўзвышаць любую дзейнасць, забяспечваць яе высокія вынікі. Матэрыяльныя аб’екты самі па сабе не з’яўляюцца ўвасабленнем культуры. Яны разглядаюцца як такія ў тым выпадку, калі становяцца ідэальным узорам чалавечай працы і накіраваны на ўдасканаленне асобы. Духоўная культура чалавека, укладзеная ў матэрыяльныя аб’екты, вяртаецца да яго ў выглядзе больш гуманістычна аформленага прадметнага асяроддзя, якое ўзвышае чалавека. Чалавек таму і ёсць мера ўсіх рэчаў, што рэчы, у сваю чаргу, служаць мерай уласнай яго чалавечнасці. Спецыяліст з неразвітым густам, нізкім узроўнем духоўнай культуры, неразвітым успрыманнем эстэтычных катэгорый абыякавы да выконваемай работы, да яе якасці, вынікаў і эстэтычнага афармлення, і, што самае галоўнае, сам працэс работы не прыносіць яму радасці, задавальнення, разумення ўласнай значнасці.

Працэс фарміравання культуры спецыяліста з’яўляецца бясконцым працэсам станаўлення, самавыяўлення, індывідуалізацыі асобы. Чым вышэй духоўнае развіццё асобы, тым больш актыўным з’яўляецца яе стаўленне да культурнага асяроддзя.

Культурнае асяроддзе неабходна чалавеку для яго духоўнага і маральнага жыцця, для яго “духоўнай аседласці”, маральнай самадысцыпліны і сацыяльнай актыўнасці. Вось чаму, ажыццяўляючы пераход да двухузроўневай сістэмы вышэйшай гуманітарнай адукацыі, неабходна ўлічваць яе культурагенны характар, культуратворчыя і чалавекафарміруючыя функцыі гуманітарнай адукацыі.

Адукацыя, захоўваючы за сабой ролю важнейшай часткі сферы жыцця грамадства, усё больш крышталізуе функцыю арганічнай часткі асабістага жыцця чалавека, набываючы рысы мэтанакіраванасці, ідэалізацыі ўзроўню валодання глабальнай і нацыянальнай культурай. Улічваючы гэта, вучэбныя планы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў дапоўнены шэрагам дысцыплін, якія звязаны з гісторыяй, духоўнай культурай беларусаў. Сёння студэнты вывучаюць у значна большым аб’ёме гісторыю Беларусі, беларускую літаратуру, беларускую мову, этнаграфію і фальклор. Значна пашыраны аб’ём курсаў, якія закладваюць у студэнтаў асновы ведаў беларускай народнай культуры. Уведзена і чытаецца для ўсіх студэнтаў гісторыя нацыянальнай культуры. Створаны і працуюць кафедры культуралогіі, этналогіі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклору. З 2003 г. функцыянуе факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Яго студэнты знаёмяцца з гісторыяй беларускага тэатра, харэаграфічнага і выяўленчага мастацтваў, а таксама з асноўнымі этапамі і адметнымі рысамі станаўлення і развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Студэнты факультэта музычнага мастацтва вывучаюць у курсе "Беларуская народная творчасць" праблемы развіцця беларускага музычнага фальклору, авалодваюць выканальніцкім майстэрствам на самабытных музычных інструментах. Спрыяе гэтаму і лабараторыя беларускіх народных духавых інструментаў, дзе ствараюцца новыя і адраджаюцца неапраўдана забытыя старажытныя народныя інструменты. Выкладчыкамі кафедры беларускай народнай песеннай творчасці значная ўвага надаецца расшыфроўцы і аранжыроўцы беларускіх народных песень. Студэнты з гэтай мэтай удзельнічаюць у фальклорных экспедыцыях, дзе збіраюць узоры народнай песеннай творчасці, якія пасля становяцца матэрыялам для выканальніцкай практыкі ў мастацкіх калектывах. Істотна перагледжаны і ўдакладнены вучэбныя планы і праграмы на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый. Распрацаваны і чытаюцца курсы "Бібліяграфічнае забеспячэнне адраджэння беларускай культуры", "Беларуская бібліяграфія", "Бібліяграфія беларускага замежжа" і іншыя. Знайшлі магчымасць інтэнсіфікацыі працэсу беларусізацыі выкладчыкі кафедраў філасофіі, культуралогіі, псіхалогіі і педагогікі. Па многіх дысцыплінах, якія выкладаюцца студэнтам на пералічаных кафедрах, выдзелены тэмы, прысвечаныя развіццю беларускай навуковай думкі. Так, напрыклад, выкладчыкі кафедры філасофіі чытаюць курсы "Развіццё філасофскай думкі ў Беларусі", "Асаблівасці фарміравання маральнай культуры беларускага народа", "Рэлігійнае жыццё ў Беларусі". Актуальныя тэмы асвятляюцца на занятках па сацыялогіі і эканоміцы.

Максімальна выкарыстоўваюць беларускую праблематыку выкладчыкі кафедры педагогікі і псіхалогіі. У курсе педагогікі выдзелены такія тэмы, як "Развіццё асветы ў старажытных беларускіх княствах", "Асветніцкая дзейнасць К.Тураўскага, Е.Полацкай, Ф.Скарыны, С.Полацкага", "Асвета на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст." і інш. У курсе "Асновы музычнай педагогікі" распрацавана дацэнтам М.Л.Кузьмінічам тэма "Музычнае выхаванне і адукацыя ў Беларусі".

Вядома, што мова – гэта матэрыялізаваная свядомасць народа. Нельга стварыць культуру ў адрыве ад мовы этнасу, бо мова – гэта важная частка нацыянальнай духоўнай культуры. Таму ва ўніверсітэце надаецца шмат увагі пераводу навучання на родную мову. У адпаведнасці з рашэннем савета ўніверсітэта пераважная большасць гуманітарных і спецыяльных дысцыплін выкладаюцца на беларускай мове. Напрыклад, у ліку бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін можна назваць такія, як "Гісторыя і тэорыя бібліяграфіі", "Абслугоўванне чытачоў", "Усеагульная гісторыя кнігі", "Бібліяграфія мастацкай літаратуры па мастацтве" і інш. На беларускай мове праводзяцца заняткі па гісторыі мастацтваў, дысцыплінах псіхолага-педагагічнага і культуралагічнага цыклаў. Сярод спецыяльных прафілюючых дысцыплін на беларускай мове чытаюцца курсы "Методыка навучання ігры на духавых інструментах", "Асновы музычнай педагогікі", "Хоразнаўства", "Беларускі танец", "Гісторыя харэаграфіі", "Моўнае дзеянне ў свяце", "Інструментазнаўства", "Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята".

Па прычыне пераходу на выкладанне на беларускай мове перад выкладчыкамі ўзніклі пэўныя складанасці, таму што пераважная большасць вучэбнай літаратуры надрукавана на рускай мове. У сувязі з гэтым вядзецца работа па распрацоўцы беларускамоўных вучэбных праграм. Выкладчыкі ўніверсітэта інтэнсіўна працуюць над стварэннем і перакладам шэрага падручнікаў на беларускую мову.

Увядзенне ў навучальны працэс дысцыплін традыцыйнай беларускай культуры, безумоўна, узмацняе культурны кантэкст гуманітарнай адукацыі. Задача кафедраў – вызначыць неабходную інфармацыю, яе прапорцыі, этапы, формы і метады засваення. У гэтым заключаецца сутнасць сучаснага педагагічнага арганізаванага працэсу авалодання культурай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ